Творческий проект
" АнТРИсоль"

Детская
ЭКО
Студия

ЧИСТЫЙ ЛЕС
ДЛЯ ВИШНЕВЦА

# ПТУШЫНАЯ ВІКТАРЫНА

Bird
watch.by
ПТУШКІ ШТОДНЯ
BIRDING IS OUR RELIGION

АПБ
Грамадская арганізацыя
«Ахова птушак Бацькаўшчыны»
www.ptushki.org

# 1. ЯКУЮ ПТУШКУ ЛІЧАЦЬ ГАСПАДЫНЯЙ НАЧНОГА ЛЕСУ?

# САВА (на здымку ВУШАТАЯ САВА)



Самы звычайны від нашых соваў. Птушка ўскрайкаў лясоў і старых паркаў, дзе займае гнёзды гракоў ці шэрых варон. Харчуецца ў асноўным, грызунамі. Птушаняты рана выбіраюцца з гнязда і вельмі гучна пішчаць усю ноч, каб бацькі ведалі, дзе яны і кармілі. Можа гнездаваць нават узімку.

# 2. ГЭТУЮ ПТУШКУ НАЗЫВАЮЦЬ «ДАПАМОЖНІКАМ» ІНШЫХ ПТУШАК

ДАРЭЧЫ, У ЯЕ САМЫ ДОЎГІ ЯЗЫК

# ДЗЯЦЕЛ (на здымку малы дзяцел)



Птушка змешаных і лісцевых лясоў, сустракаецца ў старых парках і садах. Харчуецца, ў асноўным, насякомымі. Гняздо ў самаробным дупле ў старых або хворых дрэвах. Зімуюць. Самка добра адрозніваецца ад самца.

# 3. ЯКАЯ ПТУШКА НАШЫХ ЛЯСОЎ ЛЕПШ ЗА ЎСІХ ПЕРАЙМАЕ ПТУШЫНЫМ ГАЛАСАМ?

# ШПАК (на здымку звычайны шпак)



Адна з самых звычайных птушак старых лясоў, паркаў, садоў. Гняздо ў дупле, таму патрэбныя або старыя дуплістыя дрэвы, або шпакоўні. Харчуецца і безхрыбетнымі, і сочнымі пладамі. Пасля сезону гнездавання збіраюцца ў групы да некалькі тысяч птушак. Пералётная, зрэдку зімуе.

**4. ЯНА ЁСЦЬ ВЯЛІКАЯ, ЁСЦЬ СІНЯЯ, ЯШЧЭ ЧУБАТАЯ І СІВАЯ.**

**На літару “С”**

ЗІМОЙ У МАРАЗЫ ЛЮБІЦЬ ЛАСАВАЦЦА САЛАМ, НАСЕНЕМ СЛАНЕЧНІКА

# Вялікая сініца



**Адна з самых звычайных птушак нашых лясоў і гарадоў. Гняздо – ў дупле, таму патрэбны старыя і дуплістыя дрэвы (або сінічнікі). Харчуецца безхрыбетнымі, узімку таксама насеннем травяністых раслін. Застаецца на зіму.**

# Сіняя сініца



**Звычайная птушка лясоў, паркаў і садоў.**

# Чубатая сініца (ЗДЫМАК З ІНТЭРНЭТУ)



**Птушка хваёвых (сасновых) лясоў.**

# Сівая сініца



**Птушка змешаных лясоў.**

# 5. УЗІМКУ НІ З КІМ НЕ ПЕРАБЛЫТАЕШ

**БЫЦЦАМ ЧЫРВОНЫ ЯБЛЫК НА СНЕЗЕ**

# ГІЛЬ (ЗДЫМАК З ІНТЭРНЭТУ)



**У невялікай колькасці гняздуе ў старых цёмнахвойных участках лясоў, у большай колькасці сустракаецца ўзімку, калі харчуецца насеннем клёнаў і ясеняў, ягад, пупышкамі кустоў і дрэваў. Самка добра адрозніваецца ад самца.**

# 6. Адна з самых прыгожых і крыклівых лясных птушак.

**ХАВАЕ НА ЗІМУ ГАРЭХІ, ЖАЛУДЫ**

# СОЙКА

(ЗДЫМАК З ІНТЭРНЭТУ)



**Харчуецца безхрыбетнымі і жалудамі, апошнія можа запасаць на зіму, хаваючы ў вялікай колькасці, чым дапамагае распаўсюджвацца дубу. Зімуе.**

# 7. КАЖУЦЬ, ШТО ЛЕПШ ЗА ЎСІХ СПЯВАЕ

# САЛАВЕЙ (на здымку усходні салавей)



**Птушка старых і вільготных участкаў лесу з падростам, паркаў з густым хмызняком. Адзін з самых вядомых і прыемных спевакоў сярод нашых птушак, спявае пераважна ўначы. Гняздо на зямлі. Харчуецца безхрыбетнымі, пералётны.**

**Хочаш больш даведацца пра нашых птушак? – заходзь на сайт “Птушкі штодня” www.birdwatch.by**

**Хочаш захаваць нашу прыроду і яе птушак – далучайся да грамадскай арганізацыі “Ахова птушак Бацькаўшчыны” (АПБ)**

**www.ptushki.org**

**Маеш пытанні пра дзікіх птушак? Як далучыцца да назіранняў за імі? – тэлефануй у Гродзенскае абласное аддзяленне АПБ (+375) 33 6887589**

**Здымкі птушак Мікалая Гулінскага і Сяргея Чарапіцы.**

**Тэкст падрыхтаваў Дзьмітры Вінчэўскі**

# Пытанні для вас шукала Лізавета Мерляк

**ДЗЯКУЕМ ЗА ЎДЗЕЛ!**